***Еўсюкова Марыя, Кулак Андрэй, Еўтуховіч Дзмітрый, Дзем'янкова Варвара,*** *вучні 4 класа сярэдняй школы № 11 г. Пінска Брэсцкай вобласці*

***Каравайчык А. П.****, настаўніца пачатковых класаў сярэдняй школы № 11 г. Пінска Брэсцкай вобласці*

***Сачкоўская Л. М.****, настаўніца пачатковых класаў сярэдняй школы № 11 г. Пінска Брэсцкай вобласці*

# Палескія сцяжынкі Якуба Коласа

## Даследчая праца

### Уводзіны

Сэнс жыцця нашага — бесперапынны рух.

*Я. Колас*

Мы жывем на Палессі — цудоўным краі лясоў і лугоў, рэк і балот, дзе прырода зачароўвае сваёй некранутасцю і таямнічасцю, дзе кожны куточак дыхае гістарычным мінулым. Жывуць тут цікавыя людзі, якія размаўляюць на сваёй мове, падобнай да рускай, беларускай, украінскай і нават польскай адначасова. А колькі знакамітых людзей, якіх натхняла Палессе і якія ўславілі яго на стагоддзі сваёй творчасцю, ведамі, працавітасцю і гераічнасцю! Гэта і Хаім Вейцман — першы прэзідэнт Ізраіля, і Іван Уладзіслававіч Жалтоўскі — архітэктар, мастак, і Голда Меір — 4-ы прэмьер-міністр Ізраіля, і Напалеон Орда — кампазітар, мастак, і Яўгенія Янішчыц — паэтка.

Гэты спіс можна працягваць доўга, але мы лічым, што асаблівае месца ў ім займае беларускі пясняр Якуб Колас (1882–1956), пра якога нельга гаварыць без хвалявання і сардэчнай удзячнасці. Мы ведаем, што ён славуты беларускі празаік, вучоны, адзін з заснавальнікаў сучаснай беларускай літаратуры, народны паэт Беларусі.

На ўроках беларускай літаратуры мы ўжо пазнаёміліся з некаторымі яго творамі: «Усход сонца», «Песня аб вясне», «Зіма», «Прылёт птушак», «Адлёт жураўлёў», «Вясна», «Ясныя дні восені» — і даведаліся, што амаль шэсць гадоў ён жыў і працаваў настаўнікам у нашым родным краі. Нас вельмі ўразіла, што лёс Якуба Коласа цесна звязаны з Піншчынай. Мы зацікавіліся: а дзе ён жыў на Палессі? Дзе працаваў? Па якіх вуліцах ён хадзіў? Якія творы ён напісаў у гэты час? Якім ён быў чалавекам, настаўнікам, пісьменнікам? Якую ролю Палессе адыграла ў творчасці і жыцці Якуба Коласа?

Мы ведаем, што набліжаецца 140-годдзе з дня нараджэння песняра. А нашы настаўнікі расказалі, што гэта будзе трайны юбілей: спаўняецца яшчэ і 120 гадоў з дня першага прыезду Якуба Коласа на Палессе, і 110 гадоў з дня знаходжання яго ў горадзе Пінску. Як цікава атрымалася!

Мы вырашылі ў гонар гэтых дат дакрануцца да лёсу Якуба Коласа: прайсці яго палескімі сцежкамі і скласці віртуальную карту нашага маршруту.

*Мэта:* ушанаванне памяці Якуба Коласа праз стварэнне агульнадаступнага электроннага інфармацыйнага рэсурса.

Для дасягнення мэты пастаўлены наступныя *задачы*:

- пазнаёміцца з біяграфічнымі звесткамі Якуба Коласа;
- даведацца пра творчасць, педагагічную і грамадскую дзейнасць песняра на Палессі;
- даследваць спосабы ўшанавання памяці Якуба Коласа ў нашым краі;
- стварыць інтэрактыўную Google Карту «Палескія сцяжынкі Якуба Коласа».

## 1. «Многа дарог перамералі мае ногі».

*«Многа дарог перамералі мае ногі»,* — так гаворыў Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч — гэта сапраўднае імя Якуба Коласа. І гэта на самой справе так. За сваё жыццё яму давялося пабываць у многіх месцах, пачынаючы са сваёй роднай Прынёманшчыны да Пярмі, Каўказа, Ташкента. Не мінулі яго ногі і з нашага палескага краю.

Каб уявіць схему нашага маршруту «Палескія сцяжынкі Якуба Коласа», мы вырашылі пачаць працу з Народнага літаратурна-краязнаўчага музея Якуба Коласа ў вёсцы Пінкавічы.

Застаюцца ўбаку былы маёнтак Скірмунтаў Альбрэхтова, прыдарожная капліца… І вось яна — «коласаўская школка».

На вуліцы Якуба Коласа нас сустрэла загадчыца музея, Верыч Жанна Мікалаеўна. Мы накіраваліся ў музей, які знаходзіцца на тым самым месцы, дзе раней стаяла драўляная школа. Жанна Мікалаеўна расказала, што школа мела на той час іншы выгляд. Было два ўваходы: адзін у класы, дзе займаліся дзеці, а другі ў кватэру настаўніка.

За музеем можна ўбачыць калодзеж, створаны на месцы крынічкі, вада з якога надавала тады яшчэ маладому настаўніку прыродную сілу і энергію зямлі. А каля музея — прыгажуня бяроза, якую пасадзіў брат Якуба Коласа Міцкевіч Іосіф Міхайлавіч да 90-годдзя з дня нараджэння паэта.

Мы ўвайшлі ў першую залу. Гэта быў клас для маленькіх дзяцей. Там мы ўбачылі адзенне, у якім прыходзілі дзеці на заняткі. Нас вельмі зацікавіў буквар таго часу: літары крыху адрозніваюцца ад сучасных. Тут пабачылі і кнігу для чытання, і грыфельную дошчачку, на якой дзеці пісалі кожны ўрок. Аказваецца, не ва ўсіх былі тады сшыткі, таму на кожнай парце і была такая дошчачка. Мы пабачылі і торбачкі, у якіх вучні насілі кніжкі, алоўкі і сшыткі. Усяго ў класе вучылася 45 дзяцей: 43 хлопчыкі і 2 дзяўчынкі. Тут жа фотаздымкі вучняў і іх успаміны пра свайго настаўніка, вершы, напісанныя ў «пінкавіцкі перыяд», і іншыя творы паэта (*дадатак 1*).

Жанна Мікалаеўна распавяла, што ў вольны час Канстанціна Міхайлавіча запрашалі спяваць у царкоўны хор пінкавіцкай царквы, да якой мы прагуляліся пасля экскурсіі ў музеі.

А яшчэ мы пачулі цікавую гісторыю пра вучняў Канстанціна Міхайлавіча, якім было вельмі цікава паглядзець, што ж робіць настаўнік пасля заняткаў. Ім здавалася, што ён не такі чалавек, як усе: не так ходзіць, не так спіць. І яны часта хадзілі пад акно, стукалі і ўцякалі. Калі аднойчы ў зімовы вечар хлопчыкі пастукалі,

Канстанцін Міхайлавіч выглянуў у акно. Хлопцы схаваліся. Потым яшчэ раз пастукалі. Настаўнік здагадаўся, што гэта былі дзеці. Ён ціхенька выйшаў, абышоў дом і паймаў хлопчыкаў. Дзеці спужаліся, падумалі, што настаўнік іх зараз наб'е, паставіць у кут або раскажа бацькам пра іх свавольствы. Але Канстанцін Міхайлавіч запрасіў іх у свой пакой, паказаў, дзе ён спіць, працуе, рыхтуецца да заняткаў, напаіў дзяцей гарбатай.

У гэтым пакоі мы пабачылі стол, дзе часта сядзеў і правяраў сшыткі настаўнік.

Такім чынам, мы можам зрабіць вынік, што «коласаўская школка» адрознівалася ад сучаснай. Мы зразумелі, што Канстанцін Міхайлавіч быў добразычлівым, уважлівым, гасцінным, паважаным чалавекам сярод вучняў і аднавяскоўцаў.

## 2. «Я на свет радзіўся пад глухі шум бору…»

Пры шляху шырокім,
Дзе стаіць камора,
Я на свет радзіўся
Пад глухі шум бору…

*На раздарожжы*

Экспанаты дзвюх другіх залаў распавялі нам пра жыццёвы і творчы шлях паэта: дзяцінства на берагах Нёмана, вучобу ў Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі і іншае.

Каб лепш зразумець чалавека, трэба зазірнуць у яго дзяцінства, адкуль усё пачыналася. Жанна Мікалаеўна нам паведаміла, што Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч нарадзіўся 3 лістапада 1882 года ў засценку Акінчыцы, у сям'і Міхаіла (Міхала) Казіміравіча і Ганны Юр'еўны Міцкевічаў. Яго бацька служыў лесніком. Чалавек ён быў невялікай адукацыі: умеў распісацца, чытаць па-польску і па-руску. Маці была зусім няграматная, але разумная ад прыроды і добрая жанчына. Кастусь рос у сям'і, дзе было 13 дзяцей (*дадатак 2*).

Калі трое старэйшых сыноў падраслі (а Канстанцін Міхайлавіч быў трэцім) бацька надумаў наняць хатняга настаўніка — «дарэктара», як гаварылі ў той час. Што гэта быў за «дарэктар»? Якуб Колас у паэме «Новая зямля» успамінае:

А сам дарэктар, з вузел ростам,
У сваім уборы бедным, простым,
У згрэбных портках і кашулі
Стаіць, як бы яго прыгнулі.

Гэта быў хлопчык дванаццаці гадоў — Яська (Іван Васільевіч Міцкевіч), які разам з дзецьмі летам пасвіў кароў, коней. Але ж ён быў граматнейшы. Ведаеце колькі класаў ён скончыў? Тры класы! Яго бацька наняў за тры рублі на зіму.

У сям’і Канстанціна Міхайлавіча жыў таксама і брат бацькі — дзядзька Антось. У яго не было сваёй сям’і і дзяцей, і таму ўсю любоў і веды ён аддаваў сваім пляменнікам. Яго часта можна было ўбачыць на ўзгорку леса, на беразе ракі, дзе ён расказваў байкі І. А. Крылова, якога так любіў. Кастусь заўсёды садзіўся наперадзе дзядзькі і вельмі ўважліва слухаў (*дадатак 3*).

На прыканцы хатняй вучобы, у 12-гадовым узросце, Кастусь напісаў свой першы верш «Вясна» і прачытаў яго бацьку. Міхаіл Казіміравіч не паверыў. Запытаў у дзядзькі, ці праўда, што Кастусь сам напісаў. Той адказаў, што гэта так. І бацька за гэта даў Кастусю срэбны рубель. Нас уразіла, што за тры рублі ў той час можна было купіць карову. Вось як высока ацаніў бацька верш сына!

Бацька бачыў, што ў хлопца ёсць здольнасці і хацеў даць яму адукацыю. Канстанцін Міхайлавіч два гады навучаўся сам, потым у Мікалаеўшчынскай школе, далей паступіў у Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю. Там ён з поспехам здаў іспыты і вучыўся на працягу чатырох год.

Ужо ў Нясвіжскай семінарыі Канстанцін Міхайлавіч пісаў на рускай мове свае першыя вершы. А як ён пачаў пісаць на беларускай? Аказваецца, па прапанове Ф. А. Кудрынскага (класнага кіраўніка) будучы пясняр сабіраў шмат фальклорнага матэрыялу: казкі, забаўлянкі, загадкі, легенды. Разам з гэтым матэрыялам

Канстанцін Міхайлавіч даў настаўніку свой верш на беларускай мове. Радасна было Міцкевічу пачуць ад настаўніка: *«Вось дзе ваша сапраўднае прызванне. Пісаць на мове свайго народу»*. Так і пачаў Канстанцін Міхайлавіч пісаць вершы.

Такім чынам, мы можам зрабіць вывад, што сям'я стварала ўмовы для набыцця адукацыі і развіцця творчых здольнасцей будучага песняра, а вялікі штуршок да паэтычнай дзейнасці надаў класны кіраўнік у семінарыі.

**3. «Дзень добры, новая мясціна!»**

Калі ж з'явіўся пясняр у нашым краі? Розныя крыніцы даюць розныя звесткі. Мы з настаўнікамі звярнуліся да сайта gantsevichi.museum.by.

Аказваецца, 28 жніўня 1902 года рашэннем Савета Мінскай дырэкцыі народных вучылішчаў Канстанцін Міхайлавіч напраўляецца з 1 кастрычніка настаўнікам Ахоўскага народнага вучылішча Пінскага павета, прызначэнне аб якім ён атрымаў толькі 24 верасня. Як было ўстаноўлена літаратуразнаўцам Генадзем Васільевічам Кісялёвым, рашэнне аб накіраванні Канстанціна Міхайлавіча на працу ў вёску Ахова Пінскага павета прайшло ўсе інстанцыі аж да папячыцеля Віленскай навучальнай акругі, але звестак аб настаўніцкай дзейнасці пісьменніка ў Ахова няма.

Відаць, неўзабаве гэтае рашэнне было перагледжана. У тым жа 1902 годзе Якуб Колас атрымаў пасаду настаўніка ў Люсінскім народным вучылішчы таго ж Пінскага павета. Так ён прыехаў працаваць на Палессе, у вёску Люсіна. Тут ён часта гутарыў з мясцовымі жыхарамі, цікавіўся іх жыццём, бытам, чытаў лекцыі для сялян. У Люсіна пясняр пачаў пісаць першую частку сваёй трылогіі «На ростанях» — аўтабіяграфічную повесць «У палескай глушы», у якой ярка і праўдзіва адлюстраваў жыццё і быт сялян Люсіна. У аповесці вёска падаецца пад назвай Цельшына.

Там ён адпрацаваў два гады і папрасіўся, каб яго перавялі ў іншую мясціну. Чаму? Мы запыталіся ў настаўнікаў. Аказваецца, ён закахаўся ў дачку пана. Але пан не захацей аддаць за яго сваю дачку, адвёз яе ў Навагрудак і там выдаў замуж. Вельмі засумаваў настаўнік і папрасіўся, каб яго перавялі ў іншую мясціну.

Калі яму сказалі, што ён паедзе працаваць у вёску Пінкавічы, Канстанцін Міхайлавіч раскрыў карту, паглядзеў і, не ўбачыўшы гэтага месца на карце, вельмі збянтэжыўся. *«Ну,* — думае, — *направяць меня туды, дзе і Макар цяля не пасвіў».* Сапраўды, вёска Люсіна знаходзілася сярод балот, лесу. Але і тая ж была на карце. А Пінкавічаў не было.

І калі Канстанцін Міхайлавіч сеў у цягнік, ён спытаў у незнаёмага мужчыны: *«Ці ведаеце вы вёску Пінкавічы?»* Гэты чалавек адказаў: *«Ведаю. Не хвалюйцеся, яна знаходзіца недалёка ад горада Пінска, усяго ў некалькіх вярстах».*

Дзень добры, новая мясціна!
Спаткай ты нас, як маці сына…
Узброй надзеямі нам грудзі,
Бо мы твае, зямелька, людзі!..

*Новая зямля*

У гэтай вёсцы Канстанцін Міцкевіч жыў і працаваў на працягу двух гадоў (1904–1906).

У Пінкавічах Якуб Колас напісаў першыя дваццаць вершаў з паметкай «Вёска Пінкавічы», якія ўвайшлі ў першы з чатырнаццаці тамоў акадэмічнага выдання твораў паэта. Гэтыя вершы напісаны на рускай мове і з'яўляюцца спробай пяра, пошукам сваёй творчай індывідуальнасці. Сярод вершаў вызначаецца верш «Не пытайцеся, не прасіце…» (1904), які з'яўляецца своеасаблівым творчым маніфестам. Мы спыталіся, чаму ён пісаў на рускай мове? Справа ў тым, што ў той час дзяцей вучылі менавіта на рускай мове, таму што беларуская мова была забаронена.

Цікава, што ў вёсцы Пінкавічы пад вершам «Наш край» (1906) і з'явіўся яго першы псеўданім — Якуб Колас.

Такім чынам, мы бачым, што на Палессі Канстанцін Міхайлавіч атрымаў свой першы педагагічны вопыт, фарміраваў свой індывідуальны стыль напісання твораў, менавіта ў гэты перыяд з'явіўся і яго вядомы псеўданім.

## 4. «За справядлівае жыццё!»

У музеі мы даведаліся, што ў 1905 годзе, калі пачаўся рэвалюцыйны рух, сяляне вёскі Пінкавічы ўзняліся супраць пана Скірмунта. Чаму? Бо да пана сяляне карысталіся балотамі, ракой. А пан Скірмунт забараніў гэта. Сяляне вырашылі спаліць маёнтак пана. Яны пайшлі да Канстанціна Міхайлавіча, каб параіцца. На што Канстанцін Міхайлавіч адказаў: *«Што вы гэтым даб'ецеся? Вас пасадзяць у турму. Хто тады будзе гадаваць вашых дзяцей? Давайце лепш петыцыю пану напішам».*

Яны напісалі і паслалі петыцыю пану, але адказу так і не дачакаліся. Надыходзілі Каляды. Сяляне прывыклі, што ў іх заўсёды на свята на стале была рыба. І зноў пайшлі яны да настаўніка параіцца. На што Канстанцін Міхайлавіч адказаў: *«Пан ловіць, і вы лавіце рыбу».* Шмат налавілі сяляне рыбы, але скарыстацца ёй так і не змаглі. Знайшліся здраднікі і выдалі настаўніка і сялян. Прыехалі казакі і арыштавалі ўсіх. Два тыдні Канстанцін Міхайлавіч сядзеў у турме, але ён здолеў даказаць, што сяляне нічога дрэннага не зрабілі, таму што пан жывы і маёнтак цэлы. Сялян і настаўніка адпусцілі. Але на Канстанціна Міхайлавіча памешчыкі напісалі дакладную інспектару народных вучылішч у Мінск, каб яго перавялі адсюль. Яны лічылі, што менавіта Канстанцін Міцкевіч падбухторваў сялян да бунту. Так перавялі Канстанціна Міхайлавіча ў вёску Верхаль за Мінск. Нас усхвалявалі словы Якуба Коласа: *«Вельмі мне падабаецца вёска Пінкавічы і вучні. Але што зробішь?! Лепш недзе працаваць, чым сядзець у турме».*

Дзе ж, дарога ты другая?
Я стаю адзін, адзін,
Ноч вакол ляжыць глухая…
Ці ж то свет сышоў ў клін?

*На ростанках*

Нам цікава было даведацца, што пясняр у ліпені 1906 года ўдзельнычаў у нелегальным з'ездзе настаўнікаў, за што быў пазбаўлены права працягваць педагагічную дзейнасць, але ў гэты перыяд (1907−1908) ён складаў вучэбныя

дапаможнікі, працаваў у прыватных школах, на працягу шасці тыдняў быў загадчыкам літаратурнага аддзела газеты «Наша ніва», задумаў і пачаў пісаць лірыка-эпічную паэму «Новая зямля». У 1908 годзе Якуб Колас здзейсніў падарожжа ў Пецярбург. У той час настаўнікі падымаліся на барацьбу за лепшае сялянскае жыццё, за вызваленне ад грамадзянскай і палітычнай няволі, за поўную рэформу школы. Усіх, хто быў на гэтым сходзе, арыштавалі і хутка адпусцілі, акрамя Канстанціна Міхайлавіча. Яго на тры гады пасадзілі ў турму. Чаму? Бо ўсе адказаліся ад падпісанай імі петыцыі, а Канстанцін Міхайлавіч гэтага не зрабіў, бо ён трымаў сваё слова. Мы лічым, што сядзеў ён у турме не толькі за сябе, але і за ўсіх тых настаўнікаў.

Хоць навіслі густа хмары,
Хоць на змор мяне бяруць, —
Не! мяне не справяць кары,
Толькі злосці паддадуць!

*Не дамся*

Такім чынам**,** мы зразумелі, якое моцнае пачуццё справядлівасці, мужнасць, сіла волі былі ў Якуба Коласа. Палітычны прыгнёт не зламіў яго перакананняў, ён усё гэтак жа быў аддany настаўніцтву, творчасці.

### 5. «А твой вобраз маім прыглядзеўся вачам…»

*«А твой вобраз маім прыглядзеўся вачам, да цябе маё сэрца ляжыць»,* — так пісаў паэт у вершы «Палессе» пра наш край. І гэта нездарма. З аўтабіяграфіі песняра мы дазналіся, што пасля выхаду з турмы ў верасні 1911 года Якуб Колас жыў у Лунінцы ў свайго таварыша В. Філіповіча, займаўся з яго вучнямі — дзецьмі чыгуначнікаў. У 1912 годе атрымаў пасведчанне аб добранадзейнасці і зноў трапіў на Піншчыну працаваць настаўнікам у вёску Купяцічы, дзе цяпер адна з вуліц носіць яго імя. Настаўнікі беларускай мовы Купяціцкай сярэдняй школы А. М. Вабішчэвіч і В. М. Еўтуховіч нам расказалі, што Якуб Колас прыехаў у вёску, але настаўнічаць яму не давялося, бо прызначэнне было ўмоўным, каб перавясціся ў

Пінск. Так ён стаў працаваць у трэцім прыходскім вучылішчы Пінска (цяпер Чыгуначная вуліца, 25), настаўнікі якога насілі форму.

Прадоўжылі сваё даследванне мы ў Музеі Беларускага Палесся. Нас сустрэла намеснік дырэктара па навуковай працы Кулагіна Ларыса Анатольеўна і расказала пра жыццё Якуба Коласа ў 1912–1915 гадах у нашым горадзе Пінску. Мы даведаліся, што гэта быў плённы перыяд і ў творчым, і ў асабістым жыцці Канстанціна Міхайлавіча. Нягледзячы на тое, што педагагічная дзейнасць забірала амаль увесь час, ён пісаў шмат літаратурных твораў. Толькі ў 1912 годзе ім надрукавана ў зборніках «Наша Ніва» і «Маладая Беларусь» больш за дваццаць апавяданняў і вершаў. Сярод іх: апавяданні «Дзеравеншчына», «Недаступны», «Батрак», «Старасць не радасць», «Зло — не заўсёды зло», урыўкі з паэмы «Новая зямля», вершы «Дні ідуць за днямі», «Агляд зямлі», «Думкі адзінокага», «Над калыскай» і іншыя. Большасць гэтых твораў падпісана пад новым псеўданімам Тарас Гушча. А дагэтуль можна было сустрэць і іншыя літаратурныя прозвішчы песняра: Дзядзька Карусь, Кастусь, Ганна Крум і гэтак далей. Амаль столькі ж апавяданняў, легенд, вершаў створана і ў 1913 годзе.

Пясняр пасяліўся на ціхай вуліцы Вадаправоднай (цяпер Івана Чуклая, 63) (*дадатак 4*) у доме фельчара чыгуначнай станцыі калежскага рэгістратара Арсенія Балевіча. Там жа здымала пакой і маладая настаўніца Марыя Дзмітрыеўна Каменская, якая ў далейшым стала музай, таварышам, дарадцам паэта.

Нездарма спадарожніцу свайго жыцця Канстанцін Міхайлавіч знайшоў у Пінску, бо сапраўды кажуць, што самыя прыгожыя дзяўчаты жывуць на Палессі. Колас пісаў так пра іх:

Девушек много в том было собранье,
Их глазки сверкали алмазным сияньем,
Как в поле на ниве цветки-васильки,
Порхали они, как мотыльки.
И голос их нежный порой раздавался,
И смех их весёлый кругом разливался.

*Жмурки*

Вясной 1913 года Канстанцін Міхайлавіч папрасіў яе рукі. У чэрвені ў Варварынскай царкве г. Пінска адбылося іх вянчанне. Вяселле яны не гулялі, а паехалі ў шлюбнае падарожжа да маці Марыі Дзмітрыеўны на Міншчыну.

У Кантанціна Міхайлавіча і Марыі Дзмітрыеўны было тры сыны. Старэйшы сын Даніла нарадзіўся ў Пінску ў 1914 годзе. Ён стаў вядомым вучоным-хімікам, а пасля смерці бацькі арганізаваў у іх доме музей, стаў яго нязменным дырэктарам і не раз наведваў дом у Пінску, дзе нарадзіўся.

У 1914 годе Якуб Колас працягваў сваю творчую дзейнасць: надрукаваў палескую легенду «Матчына прычытанне», апавяданні «Казкі жыцця», «На начлезе», «Хмаркі», фельетон «Змаганне з п'янствам», больш за дзесяць вершаў. Усе яны з'явіліся ў зборніках «Наша Ніва» і «Лучынка».

Пінскія ўражанні пісьменніка знайшлі сваё глыбокае мастацкае ўвасабленне ў першых дзвюх кнігах трылогіі «На ростанях». Аповесці маюць выразны біяграфічны характар, шматлікія сябры і знаёмыя па Пінску і Пінкавічах сталі прататыпамі герояў гэтага твора. Тут, у Пінску, Якуб Колас напісаў першыя раздзелы «Новай зямлі», з гэтым творам мы будзем знаёміцца ў старэйшых класах. У яго творчасці сабраны неацэнны скарб душы народа і бяссмерце яго — мова. Роднае слова адшліфавана ім, як каштоўны алмаз.

Можна зрабіць вывад, што вяртянне на Палессе падарыла паэту сямейнае шчасце і натхненне на плённую творчасць: тыповыя рысы характараў яго герояў узяты з жыцця палешукоў. Якуб Колас умела сумяшчаў дзейнасць настаўніка і мастака слова.

### 6. «Мой дружа Янка…»

Перагледжваючы старонкі аўтабітяграфіі Якуба Коласа, мы даведаліся, што першая сустрэча «вока на вока» Якуба Коласа з Янкам Купалам адбылася ў жніўні 1912 года на хутары Смольня, каля вёскі Мікалаеўшчына.

Аказваецца, што Янка Купала на той час быў ужо вядомым пісьменнікам. Канстанцін Міхайлавіч любіў чытаць яго вершы і марыў з ім пазнаёміцца. Яны вялі перапіску. У адным з лістоў Якуб Колас пазваў у госці Янку Купалу.

Прыехаў Янка Купала і са станцыі Стаўбцы да вёскі ішоў пешшу. Ідзе, ідзе, ужо і цямнець пачынае. Кругом лес. Няма ў каго спытаць дарогі. Баяўся, што прыйдзецца ў вялікім незнаёмым лесе заначаваць. Раптам павеяла вільгаццю, і ўспомніў ён, што, па словах Якуба Коласа, вёска яго стаіць на беразе Нёмана. Вось і пайшоў у гэтым напрамку Янка Купала. Так і дайшоў да самай коласаўскай хаты.

Якуба Коласа, на жаль, не было дома, ён быў у сябра. Прыбегла яго малодшая сястра і кажа: *«Кастусь, да цябе госці прыйшлі — Янка Купала»*.

Канстанцін Міхайлавіч пазней успамінаў: *«Я ішоў, і ў мяне падкошваліся ногі»*. Ён не мог паверыць, што такі знакаміты чалавек прышоў да яго, пачынаючага паэта. Тут, на хутары Смольня, яны і сустрэліся (*дадатак 5*).

Такім чынам, мы зрабілі дзіўнае адкрыццё, што першая сустрэча двух вялікіх песняроў адбылася ў вёсцы Смольня, але ў час пражывання і працы Якуба Коласа на Піншчыне, бо ў 1912 годзе пясняр працаваў менавіта ў горадзе Пінску.

## 7. «Доўга будзеш ты пад небам сінім…»

У музеі Беларускага Палесся ад Ларысы Анатольеўны мы даведаліся, што на Піншчыне свята берагуць памяць аб выдатным сыне беларускага народа. У Пінску ўстаноўлены тры мемарыяльныя дошкі: па вул. Савецкай, 34, па вул. Чуклая, 63 і па Чыгуначнай вуліцы, 25.

У Музеі Беларускага Палесся захоўваюцца дзясяткі экспанатаў, сярод якіх кніга з аўтографам аўтара, пісьмо Якуба Коласа сялянам вёскі Пінкавічы з запрашэннем прыехаць да іх на святкаванне 70-годдзя, рарытэтная кушэтка з дома па вуліцы Чуклая, 63, у якім жыў Якуб Колас, кій, які належаў паэту.

Цікава, што ў 1964 годзе здымкі фільма «Першыя выпрабаванні» па матывах трылогіі Якуба Коласа «На ростанях» праходзілі там, дзе адбываліся сапраўдныя падзеі, на Піншчыне, і некаторыя музейныя экспанаты былі задзейнічаны ў кіназдымках.

Мы ганарымся, што Пінскай гарадской дзіцячай бібліятэцы, Пінкавіцкай сярэдняй школе і Люсінскаму дзіцячаму саду – сярэдняй школе прысвоена імя

Якуба Коласа, тут дзейнічае літаратурна-этнаграфічны музей Якуба Коласа. Яго імем названы вуліцы ў Пінску і Лунінцы, Пінкавічах, Купяцічах і Люсіна.

У а. г. Люсіна на месцы школы, дзе працаваў Якуб Колас, у 2021 годзе ўстаноўлены новы памятны знак. У двары сучаснай школы ёсць камень з памятнай плітою. Крамы атрымалі назвы «На ростанях» і «Ядвіся». Чыгуначны прыпынак таксама носіць імя песняра.

У горадзе Лунінцы у 2005 годзе ўсталяваны мемарыял «Якуб Колас».

На тэрыторыі Народнага літаратурна-краязнаўчага музея Якуба Коласа ахоўваюць і берагуць прыгажуню-бярозу, драўляны калодзеж. Тут у дзень нараджэння паэта, 3 лістапада, штогод праводзяць «Каласавіны», на якіх нам пашчасціла пабываць (*дадатак 6*). Там мы даведаліся, што памяць пра народнага песняра ўшаноўваецца не толькі на Палессі, а і па ўсей Беларусі. За лепшыя празаічныя творы і літаратуразнаўчыя працы два разы ў год прысуджаецца Дзяржаўная прэмія Рэспублікі Беларусь імя Якуба Коласа. Музей Якуба Коласа дзейнічае ў Мінску, а яго філіялы знаходзяцца ў Акінчыцах, Альбуці, Ластку, Смольні. Мы ведаем, што ў Мінску станцыя метро і плошча носяць яго імя, пастаўлены помнік песняру і героям яго твораў (*дадатак 7*). Імем Якуба Коласа названы драматычны тэатр у Віцебску, інстытут мовазнаўства Акадэміі навук. Мы лічым, што ўдумлівае чытанне яго кніг і ўзбагачэнне сябе іх мудрасцю — найлепшае захаванне памяці народнага паэта.

У 2022 годзе плануецца шэрах мерапрыемстваў, прысвечаных юбілею нашага песняра. Мы славім яго выключны і фенамінальны талент, мы ведаем пра яго адданасць свайму народу ў канкрэтных справах. Мы лічым, што яго жыццё — узор і прыклад усім, хто хоча пакінуць добры след пасля сябе, паслужыць Айчыне, незалежна ад таго, якой справе сябе прысвяціў.

Такім чынам, мы пераканаліся, што нават 120 гадоў, якія мінулі з часу, калі Якуб Колас упершыню ступіў на палескую зямлю, не сцёрлі з памяці палешукоў сведкі аб гэтым славутым песняры.

Мы таксама прынялі ўдзел у шанаванні памяці Якуба Коласа і на аснове звестак нашай даследчай працы стварылі электронны інфармацыйны рэсурс

https://www.google.com/maps/d/embed?mid=1qiVum8aEWJUsRDpAYuFfUCOqrhzPfijt&ehbc=2E312F&ll=52.10635053520455%2C26.09987398491068&z=10 (*дадатак 8*).

Кожны, хто цікавіцца гісторыяй Палесся, будзе мець магчымасць ажыццявіць віртуальнае або рэальнае падарожжа па палескіх сцяжынках Якуба Коласа па інтэрактыўнай Goole Карце праз сайт нашай школы, сацыяльныя сеткі ВК, Instagram музея Беларускага Палесся і інфармацыйны стэнд Народнага літаратурна-краязнаўчага музея Якуба Коласа ў вёсцы Пінкавічы.

## Заключэнне

Якуб Колас — славуты беларускі празаік, вучоны, адзін з заснавальнікаў сучаснай беларускай літаратуры, народны паэт Беларусі.

Наша даследванне паказала, што з самага ранняга дзяцінства сям'я будучага песняра падтрымлівала ўсе яго творчыя пачынанні і стварала ўмовы для набыцця адукацыі. Значны штуршок да паэтычный творчасці на роднай мове надаў класны кіраўнік у Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі.

Мы пераканаліся, што Канстанцін Міхайлавіч з'яўляўся змагаром за незалежнасць беларускага народа, беларускай зямлі ўвогуле, што ў гэтага чалавека было моцнае пачуццё справядлівасці, мужнасць і сіла волі. У часы настаўніцтва ў Люсіна ён гутарыў з аднавяскоўцамі, цікавіўся іх бытам, чытаў лекцыі для сялян, жыццё якіх адлюстраваў у трылогіі «На Ростанях». Для Пінкавіцкіх сялян ён быў сапраўдным дарадчыкам і абаронцам, за што і паплаціўся сваей свабодай. Нягледзячы на цяжкасці на сваім жыццёвым шляху: перашкоды, пакуты, арэшты, забароны — Якуб Колас заставаўся добрым, шчырым, спагадлівым, уважлівым, справядлівым чалавекам. Нічога не зламіла яго — ён працягваў працаваць і займацца творчасцю.

Мы зразумелі, што перыяд жыцця Якуба Коласа на Палессі адыграў выключную ролю ў фарміраванні яго светапогляду. Менавіта ў час пражывання песняра ў Пінску пачалося сяброўства з Янкам Купалам. У нашым краі Якуб Колас узбагачаўся новымі жыццёвымі ўражаннямі, якія потым былі па-мастацку асэнсаваныя ў шматлікіх творах. Тыповыя рысы характараў яго герояў узяты з

жыцця палешукоў. Менавіта ў Пінкавічах і з'явіўся яго афіцыйны псеўданім Якуб Колас. «Абшарыўшы кішэні сваёй памяці», уклаўшы ў матчыну мову агонь душы і сэрца жар, ён здолеў паказаць нам узнёслае ў зямным, святое ў будзённым, прыгожае ў звычайным.

Палессе падарыла паэту не толькі натхненне на плённую творчую дзейнасць, але і сямейнае шчасце. У Пінску ён абвянчаўся з Марыяй Дзмітрыеўнай Каменскай, якая ў далейшым стала яго музай, таварышам і дарадцам. Тут жа на свет з'явіўся яго старэйшы сын Даніла.

Такім чынам,  падарожжа па палескім сцяжынкам Якуба Коласа паказала, што з яго імем звязаны многія мясціны Брэсцкай вобласці: Ахова (1902), Люсіна (1902 – 1904), Пінкавічы (1904–1906), Лунінец (1911), Купяцічы (1912), Пінск (1912–1915), дзе памяць аб ім свята ўшаноўваецца да нашых дзён. Цяпер кожны, хто захоча зрабіць віртуальнае або рэальнае падарожжа па гэтым мясцінам, будзе мець магчымасць звярнуцца да нашай інтэрактыўнай карты.

Імя песняра назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах. Мы ганарымся, што ён уславіў Палессе і палешукоў на старонках сваіх твораў. Самым галоўным і лепшым помнікам Якубу Коласу з'яўляецца тое, што мы з удзячнасцю чытаем яго кнігі і ўзбагачаем сябе іх мудрасцю.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. *Грамадчанка, Т. К.* Беларуская літаратура / Т. К. Грамадчанка. — Мінск : Аверсэв, 1999. — С. 175−184.
2. *Верціхоўская, М. І.* Беларуская літаратура / М. І. Верціхоўская. — Мінск : Юніпрэс, 2002. — С. 226–232.
3. *Старычонак, В. Дз.* Беларуская літаратура / В. Дз. Старычонак. — Мінск : Вышэйшая школа, 1996. — С. 143−144.
4. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Пінскага раёна. — Мінск : БЕЛТА, 2003. — С. 132−133.
5. *Мушынскі, М. І.* Якуб Колас. Летапіс жыцця і творчасці / М. І. Мушынскі. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1982.

**6.** *Колас, Я.* Стихи и поэмы / Я. Колас. — Минск : Государственное Издательство БССР, 1948.

**7.** *Міцкевіч, Д. К.* Якуб Колас. Альбом / Д. К. Міцкевіч. — Мінск : Народная асвета, 1973.

**8.** Якуб Колас [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://ru.wikipedia.org/wiki/Якуб_Колас. — Дата доступу: 20.12.2021.

**9.** Учреждение культуры «Ганцевичский районный краеведческий музей» [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://gantsevichi.museum.by. — Дата доступа: 03.01.2022.

**ДАДАТАК 1**



*У Народным літаратурна-краязнаўчым музеі Якуба Коласа (в. Пінкавічы)*

**ДАДАТАК 2**



*Маці паэта, 1923 г.*



*Бацька паэта*
*Карціна Л. Рана.*

## ДАДАТАК 3

Дзядзька Антось
з дзецьмі

*Карціна*
*А. Малішэўскага*



## ДАДАТАК 4



Каля дома па
вул. Чуклая, 63
(раней вул.
Водаправодная)

## ДАДАТАК 5

Я. Колас
і Я. Купала.

*30-я гады*



**ДАДАТАК 6**



На свяце «Каласавіны»

*Лістапад 2021 г.*

**ДАДАТАК 7**

QR-код відэароліка з Мінску

**ДАДАТАК 8**

QR-код інфармацыйнага рэсурсу